Б.Н. Чичерин и традиции философской и социально-политической мысли в России. – Тамбов, 2013. С. 441–445.
9. Максимов, М.В. «Философский пароход» и судьбы русской философии в XX веке / М.В. Максимов // Вестник Российского философского общества. – М., 2013. № 1. С. 98–101.
10. Лойка, А.І. Ідэі М. Гусоускага і актуальныя праблемы сучаснага тэхнагеннага свету / А.І. Лойка // Веснік БДУ – 1994. – Серыя 3. – № 1. – С. 28–31.

## Адлюстраванне праблемы ўплыву канфесійнага фактару на знешнюю палітыку Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV–сярэдзіне XVI ст. у гістарычных даследаваннях

Мікалаева Л. В. г. Мінск, БДУІР

Як ў любой поліэтнічнай і поліканфесійнай краіне, у якой прадстаўнікі вядучых этнасаў, прэтэндуючыя на пануючае становішча ў дзяржаве, з’яўляліся прыхільнікамі розных канфесій хрысціянскай царквы, у Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ) рэлігійны фактар аказваў значны ўплыў на ўсе бакі палітычнага жыцця грамадства і дзяржавы, у тым ліку і на яе знешнюю палітыку. Надзвычай выразна яго ўздзеянне на гэту сферу праявілася ў канцы XV–пачатку XVI ст., асабліва на тым фоне, якім з’яўлялася знешнепалітычнае становішча ВКЛ, што аказалася ўцягнутым у адзін з тагачасных вузлоў міжнародных супярэчнасцяў.

Сутнасць яго заключалася ў даўніх спрэчках паміж ВКЛ і Вялікім Княствам Маскоўскім вакол праблемы так званай “спадчыны Рурыкавічаў”, ці “рускіх” зямель. Кожная з дзяржаў прад’яўляла свае правы на гэтыя землі [7, с. 2–7]. У канцы XV ст. іх супрацьстаянне вылілася ў першую вайну Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ 1492–1494 гг., якая паклала пачатак цэлай серыі падобных ваенных канфліктаў. На працягу 1492–1537 гг. адбылося пяць такіх войнаў, прычым толькі адна была ініцыіравана ліцвінскім бокам. Ініцыятар большасці канфліктаў, Вялікае Княства Маскоўскае, абгрунтоўвала свае экспансіянісцкія памкненні дынастычным правам на ўсходнія землі ВКЛ. На кожнае патрабаванне вярнуць захопленыя тэрыторыі маскоўскія ўладары

адказвалі, што трымаюць толькі “сваю вотчыну”, а пазней растлумачылі, што “Русская земля вся, съ божьею волею, изъ старины, отъ нашихъ прародителей наша отчина”, а вотчына літоўскіх вялікіх князёў “Лятская земля да Литовская” [15, с. 460; 9, с. 275]. Тым самым Вялікае Княства Маскоўскае давала вычарпальную фармулёўку сваёй далейшай знешнепалітычнай праграмы.

Аднак перад пачаткам другой вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ (1500 – 1503) загучалі і новыя прэтэнзіі. Каб неяк апраўдаць парушэнне мірнай дамовы 1494 г. і свае агрэсіўныя захады, маскоўскі вялікі князь Іван ІІІ аб’явіў сябе абаронцам праваслаўнага насельніцтва ВКЛ, якое быццам бы пакутавала ад уціску каталіцкай царквы [15, с. 294–295]. Тым самым маскоўскі бок, выступаючы зачынальнікам новага ваеннага канфлікта, падкрэсліваў вырашальнае значэнне рэлігійнага фактару для пачатку гэтай знешнепалітычнай акцыі, якая набыла, такім чынам, і ідэалагічную афарбоўку.

Звяртаючыся непасрэдна да заяўленай тэмы, трэба адзначыць, што для дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі не была ўласціва асаблівая цікавасць да названай праблемы. Пэўнае выключэнне складае праца прадстаўніка ўкраінскай гістарыяграфічнай школы М.С. Грушэўскага “Історія України-Руси” [5], чацвёрты том якой прысвечаны разгляду палітычных адносін ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне ў XIV–XVI стст., і закранае аспекты ўзаемаўплываў рэлігійнага і палітычныга фактараў. У прыватнасці, аўтар ставіў пад сумненне тэзіс аб ганеннях на праваслаўных як прычыне пачатку вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ 1500–1503 гг. [5, с. 278].

У даваенны перыяд аб’ём літуаністычных даследаванняў на тэрыторыі Савецкай дзяржавы значна скараціўся. Сярод публікацый гэтага перыяду звяртае на сябе ўвагу праца А.Е. Прэснякова “Лекции по русской истории” (напісаная ў 1909 г. і апублікаваная толькі ў 1939 г.), якая ўтрымлівала мноства арыгінальных і каштоўных назіранняў [17]. У гэты час у Польшчы працягвалі выходзіць артыкулы і кнігі па гісторыі ВКЛ. У 30–40-я гг. ХХ ст. тут выйшаў шэраг прац абагульняючага характару, сярод іх праца Л. Калянкоўскага, у якой на вялікім фактычным матэрыяле

разглядаліся пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі ВКЛ канца XIV–XVI стст., у т. л. іх канфесійнага складніка [21].

Адраджэнне канкрэтна-гістарычных даследаванняў у савецкай гістарыяграфіі назіралася толькі ў пасляваенны час. Разам з тым з пачатку 50-х гг. ХХ ст. у ёй надоўга зацвердзілася спрэчная канцэпцыя падзей, якія прывялі да пераходу часткі ўсходніх зямель ВКЛ пад кантроль Вялікага Княства Маскоўскага на мяжы XV–XVI стст. Сутнасць яе была ў наступным: славянскае насельніцтва ВКЛ ужо ў XV ст. пакутавала ад прыгнёту каталіцызму і імкнулася перайсці пад уладу Вялікага Княства Маскоўскага і на мяжы XV–XVI стст., дзякуючы паспяховай палітыцы маскоўскага кіраўніцтва, аб'ядналася нарэшце з адзінавернымі братамі. Гэта версія ў адносінах да ўсіх славянскіх зямель ВКЛ была прадстаўлена ў манаграфіі К.В. Базілевіча "Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV в." [1]. Фактычна да канца 80-х гг. ХХ ст. у савецкай гістарыяграфіі панавала ідэалагічная догма пра векавое непарушнае сяброўства брацкіх славянскіх народаў, паўтараўся тэзіс пра імкненне праваслаўнага насельніцтва ВКЛ да з'яднання з Вялікім Княствам Маскоўскім, актыўную дапамогу яго маскоўскім войскам. Затое ўсяляк замоўчваўся ўдзел славянскіх народаў ВКЛ у войнах з усходнім суседам.

Адносна замежнай гістарыяграфіі пасляваеннага перыяду трэба адзначыць з'яўленне прац нямецкіх даследчыкаў. Так, у 1955 г. выйшла паказальная ў многіх адносінах, класічная, вартая асобай увагі праца Х. Ябланоўскага "Westrussland zwischen Wilna und Moskau" [20]. Паставіўшы мэтай даследаваць палітычнае становішча ўсходнеславянскага насельніцтва ў ВКЛ XV ст., ён дасканала прааналізаваў беларуска-літоўскія летапісы, паколькі палітычныя тэндэнцыі фіксаваліся найперш у іх. У выніку нямецкі гісторык атрымаў не толькі цэлую шкалу меркаванняў, але і жывую карціну рэлігійных узаемаадносін, і шмат іншых цікавых назіранняў. Вучоны паказаў, што ў тым канкрэтным часе і на тэрыторыі так званай Заходняй Русі прамаскоўскай арыентацыі насельніцтва не існавала, што ўзаемаадносіны паміж рознымі канфесіямі, а таксама паміж уладай і праваслаўнай царквой у ВКЛ характарызаваліся талерантнасцю.

Радыкальны перагляд старых поглядаў у савецкай гістарыяграфіі пачаўся ў канцы 80-х гг. ХХ ст. Новы, якасна адрозны ад ранейшых

погляд на ВКЛ, яго адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім і ўплыў на іх рэлігійнага фактару знайшоў адлюстраванне ў папулярным нарысе С.В. Думіна “Другая Русь (Великое Княжество Литовское и Русское)” [6]. У ім упершыню ў савецкай гістарыяграфіі былі выказаны думкі, якія аспрэчвалі многія стэрыятыпы, у тым ліку ставіўся пад сумненне і тэзіс пра прыцягненне славянскага насельніцтва да Масквы, якая, на думку аўтара, разглядалася мясцовым насельніцтвам як адзін з самых злых ворагаў. С.В. Думін звярнуў увагу на тое, што склаўшыся яшчэ з часоў удзельнай сістэмы саюз маскоўскіх вялікіх князёў і праваслаўнай царквы прычыніўся да таго, што палітычная ідэалогія Вялікага Княства Маскоўскага была царкоўнай [6, с. 105–106], а маскоўскія вялікія князі ўспрымаліся ў ёй не столькі як нацыянальныя ўладары, колькі як уладары праваслаўнага хрысціянства. Гэтым падмацоўвалася і ўяўленне аб спадчынных правах маскоўскіх уладароў на землі населеныя праваслаўным насельніцтвам, у тым ліку і частку земляў ВКЛ. А вялікія князі літоўскія, якія валодалі імі, разглядаліся не толькі як палітычныя, але і як ідэйныя праціўнікі.

Далейшым крокам у справе перагляду панаваўшых раней поглядаў на праблему ўздзеяння рэлігійнага фактару на знешнюю палітыку ВКЛ канца XV–сярэдзіны XVI стст. стала даследаванне сучаснага расійскага вучонага М.М. Крома “Меж Русью и Литвой: западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV–первой трети XVI в.” [8].

Геапалітычныя змены ва Усходняй Еўропе ў канцы 80–90-х гг. XX ст. не прайшлі незаўважанымі польскімі даследчыкамі, у апошніх працах якіх можна ўжо заўважыць пэўныя змены пры разглядзе праблематыкі, звязанай з гісторыяй ВКЛ. Цікавыя погляды на знешнюю палітыку ВКЛ часоў Аляксандра Ягелона, уплыў на яе канфесійных момантаў выказаў у сваёй працы К. Пяткевіч [22]. З ліку навейшых даследаванняў польскіх гісторыкаў, якія прысвечаны гісторыі ВКЛ, можна назваць сінтэтычную працу Г. Блашчака, у якой важнае месца займаюць і пытанні знешняй і рэлігійнай палітыкі дзяржавы [19].

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі існуе магчымасць спаслацца толькі на нашы ўласныя публікацыі па праблеме даследавання [11; 13]. На наш погляд, рэлігійныя ганенні на

праваслаўных не з'яўляліся сапраўднай прычынай вайны Вялікага Княства Маскоўскага з ВКЛ 1500–1503 гг. Казаць пра рэлігійны прыгнёт у ВКЛ у тую эпоху не было падстаў: хаця праваслаўе было тут не пануючай, а толькі цярпімай рэлігіяй, цярпімасць гэта была дастаткова шырокай. Ніякага гвалту і рэпрэсій супраць праваслаўных тут не было, а ў пытаннях культа ім прадстаўлялася поўная свабода. Наадварот, у канцы XV ст. выразна праявілася імкненне дзяржаўных уладаў да ўнутранага ўмацавання праваслаўнай царквы.

Прыкладам добразычлівага іх стаўлення да праваслаўнай царквы і найбольш важным актам той эпохі ў гэтым накірунку можна лічыць пацвярджэнне 20 сакавіка 1499 г. вялікім князем літоўскім Аляксандрам царкоўнага статута Яраслава Мудрага [14, арк. 103–104] і забарону ў сувязі з гэтым усім свецкім асобам (каталіцкім і праваслаўным) умешвацца ў справы праваслаўнай царкоўнай юрысдыкцыі. Гэтым актам мітрапаліт атрымаў судовы імунітэт ва ўладаннях мітраполіі і ўсіх падпарадкаваных ёй епіскапстваў. Адносна зямельнай уласнасці праваслаўная царква ў ВКЛ была нават у лепшым становішчы, чым у Вялікім Княстве Маскоўскім, бо тут была гарантавана недатыкальнасць праваслаўных царкоўных уладанняў, а ў Маскве імкненні да секулярызацыі ўсё больш мацнелі Адзіным заканадаўчым абмежаваннем правоў праваслаўных у княстве на той час была прадугледжаная Гарадзельскім прывілеям 1413 г. забарона ўсім некатолікам займаць цэнтральныя пасады ў дзяржаве [4, с. 213–214], што не заўсёды выконвалася [10, с. 56–61]. Таму, зразумела, ліцвінскі бок адвяргаў заявы маскоўскіх уладаў аб уціску на праваслаўных як надуманыя, закліканыя прыхаваць захопніцкія планы ўсходняга суседа. "Отчина наша къ тому ко всему, брате, есть причина," – небезпадстаўна сцвярджалі літоўскія вялікія князі [15, с. 457]. Няшчырасць маскоўскіх уладароў-"абаронцаў" знаходзіла падмацаванне і ў іншых фактах. Асабліва яскрава пра гэта сведчылі захады вялікага князя маскоўскага Васіля III вакол набыцця трона ВКЛ пасля смерці вялікага князя Літоўскага Аляксандра. Ён нават даваў гарантыю, што калі паны "учнут опасатца за верою, и государь их в том ни в чем не порушит, как было при короле, а жаловати их хочет и свыше того" [2, с. 99].

Разам з тым, менавіта на гэты перыяд прыпадае актывізацыя дыпламатычных зносін з Рымскай курыяй у сувязі з апошняй у XV ст. спробай увядзення ў ВКЛ царкоўнай уніі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Для ВКЛ абмеркаванне пытання царкоўнай уніі мела акрамя рэлігійнага яшчэ і палітычнае значэнне, бо ў выпадку поспеху гэтых мерапрыемстваў унутраныя сувязі дзяржавы і салідарнасць грамадства несумненна ўзмацніліся б. Да таго ж маскоўскія ўладары страцілі б повад да ўмяшання ва ўнутраныя справы ВКЛ пад выглядам абароны праваслаўя. Пры гэтым трэба ўспомніць, што само стварэнне ў сярэдзіне XV ст. асобнай ліцвінскай мітраполіі з цэнтрам у Кіеве было самым цесным чынам звязана з праблемай царкоўнай уніі, а таксама са спробамі вялікіх князёў літоўскіх прывесці маскоўскую мітраполію пад свой уплыў шляхам зацвярджэння канстанцінопальскімі патрыярхамі ліцвінскіх мітрапалітаў у годнасці мітрапалітаў усяе Русі. Апошнія павінны былі станавіцца праваднікамі палітыкі вялікіх князёў літоўскіх на землях, размешчаных на Усход ад ВКЛ.

Трэба адзначыць, што пытанне царкоўнай уніі ўжо неаднаразова ўздымалася ў ВКЛ на працягу XV ст., але спробы яе ўвядзення заканчваліся нічым. Усё ж, нягледзячы на папярэднія няўдачы, у 1500 г. мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Іосіф Балгарыновіч ажыццявіў чарговую спробу правядзення ў жыццё царкоўнай уніі, пасля чаго імкненні да яе ў ВКЛ увогуле зніклі да канца XVI ст. Пры гэтым можна канстатаваць, што, выступаючы хадатаям царкоўнай уніі, ліцвінскі мітрапаліт не дзейнічаў па даручэнню праваслаўнай царквы Вялікага Княства, а хутчэй выконваў жаданне кіруючых колаў краіны. На вярхушачны характар гэтай акцыі ўказваюць і інш. сучасныя даследчыкі [8, с. 94; 3, с. 30–32; 22, с. 167–169]. Не маючы падтрымкі ні сярод католікаў, ні сярод праваслаўных, справа ўніі была асуджана на няўдачу.

Такім чынам, ужо ў канцы XV–пачатку XVI ст. кіраўніцтва ВКЛ добра ўсведамляла ўсю небяспечнасць для інтарэсаў краіны поліканфесійнага стану насельніцтва дзяржавы. Выкліканая пагаршэннем знешнепалітычнага становішча дзяржавы спроба ўвядзення ў ВКЛ царкоўнай уніі і кансалідацыі на яе аснове грамадства краіны поспеху не мела. Але па меры таго, як з канца XV ст. усходні кірунак знешняй палітыкі ВКЛ стаў прыярытэтным, канцэнтруючы на сабе не толькі дыпламатычныя, ваенныя,

але і ідэалагічныя сродкі яе ажыццяўлення, кіраўніцтву дзяржавы, выкарыстоўваючы прапагандысцкія прыёмы, удалося стварыць адмоўны вобраз адзінавернага Вялікага Княства Маскоўскага ў вачах праваслаўнай эліты ВКЛ [12, с. 309–311], якая мела значны ўплыў у іншых пластах насельніцтва ВКЛ, а таксама ў вачах еўрапейскай грамадскасці. Першае мела асабліва вялікае значэнне, паколькі тым самым ствараліся ўмовы для ўнутрыпалітычнай стабілізацыі ў дзяржаве як апоры яе знешнепалітычных акцый. Да таго ж з гэтага часу ВКЛ пачало стабільна ўваходзіць у еўрапейскую палітычную сістэму каталіцкіх дзяржаў, шукала там саюзнікаў супраць Вялікага Княства Маскоўскага і іншых праціўнікаў, а пазней і жонак для сваіх вялікіх князёў, бо вялікі князь Аляксандр быў апошнім літоўскім вялікім князем, які ўзяў шлюб з праваслаўнай (дачкой маскоўскага вялікага князя Івана III Аленай). Апошняе сведчыла пра змены і ў дынастычнай палітыцы, бо калі раней вялікія князі літоўскія маглі, застаючыся ў лоне каталіцкай царквы, жаніцца з праваслаўнымі князёўнамі, то зараз такія шлюбы сталі немагчымымі, так як Апостальскі пасад адмаўляўся прызнаваць іх законнымі [16, с. 282, 286]. Гэта спрычынілася да таго, што ВКЛ канчаткова ўвайшло ў еўрапейскую каталіцкую дынастычную сістэму.

Такім чынам, са стратай ВКЛ дамінуючага становішча ў рэгіёне, адмаўленнем ад пашырэння сваіх тэрыторый далей на Усход і з пераходам да Вялікага Княства Маскоўскага ваенна-палітычнай ініцыятывы ўплыў праваслаўнага рэлігійнага фактара на знешнюю палітыку ВКЛ губляе былое значэнне і вызначальным стае ўплыў фактара каталіцкага. Сітуацыя некалькі змянілася толькі ў сярэдзіне XVI ст., калі палітычная эліта ВКЛ пачала вызнаваць пратэстантызм. Тады рэлігійны фактар спрычыніўся да таго, што актывізавалася пранікненне ВКЛ у Лівонію. Ліцвінскую экспансію ў краіну, дзе пашыралася Рэфармацыя, ініцыявала пратэстанцкая магнатэрыя ВКЛ.

Такім чынам, праблема ўплыву канфесійнага фактару на знешнюю палітыку ВКЛ у канцы XV–сярэдзіне XVI ст. да нашага часу яшчэ не стала аб’ектам спецыяльнага дысертацыйнага даследавання. Аднак асобныя бакі гэтага пытання не былі абмінутыя даследчыкамі. Характэрнай асаблівасцю большасці публікацый з’яўляецца погляд на праблему скрозь прызму знешняй

палітыкі Вялікага Княства Маскоўскага. Спробы зазірнуць на праблему з пункта гледжання знешняй палітыкі ВКЛ у беларускай гістарыяграфіі з'явіліся толькі ў пачатку XXI і прадстаўлены пакуль што адзінкавымі артыкуламі [11, 13].

**Выкарыстаная літаратура**

1. Базилевич, К.В. Внешняя политика Русского централизованного государства: Вторая половина XV века / К.В. Базилевич. – М.: Изд-во Москов. ун-та, 1952. – 542 с.

2. "Выписка из посольских книг" о сношениях Российского государства с Польско-Литовским за 1487 – 1572 гг. // Памятники истории Восточной Европы. Источники XV – XVII вв. – Москва-Варшава: Археографический центр, 1997. – Т. 2. – 330 с.

3. Гирконтас, Р. Попытки церковной унии в Великом Княжестве Литовском в XV в. / Р. Гирконтас // Славяне и их соседи. Католицизм и православие в средние века: Сборник тезисов. – М.: Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР, 1991. – С. 30–32.

4. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах: У 4 т. – Менск: Выд. АН БССР, 1936. – Т. 1: IX–XVII ст. (Скл.: акад. В.К. Шчарбакоў, дац. К.І. Кернажыцкі і вуч. археограф Д.І. Даўгяла). – XVI, 678 с.

5. Грушевський, М.С. Історія України-Руси: В 7 т. / М.С. Грушевський. – Київ-Львів: друк. наук. т-ва ім. Шевченка, 1907. – Т. 4: XIV – XVI віки – відносини политични. – 536 с.

6. Думин, С.В. Другая Русь (Великое Княжество Литовское и Русское/ С.В. Думин// История Отечества: люди, идеи, решения. Очерки истории России IX–XX вв. / Сост.: С.В. Мироненко. – М.: Политиздат, 1991. – С. 76–126.

7. Кананові́ч, У.І. Змаганне за спадчыну Рурыкавічаў / У.І. Кананові́ч // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 5. – С. 2–7.

8. Кром, М.М. Меж Русью и Литвой: западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV–первой трети XVI в. / М.М. Кром – М.: Археографический центр, 1995. – 304 с.

9. Ловмяньский, Х. Русско-литовские отношения в XIV – XV вв./ Х. Ловмяньский // Феодальная Россия во всемирно-историческом процессе: Сборник статей, посвященных Л.В. Черепнину. – М.: Наука, 1972. – С. 269–275.

10. Малиновский, И.А. Рада Великого Княжества Литовского в связи с Боярской думой древней России / И.А. Малиновский. – Томск: Типолитография Сибирск. Т-ва Печатн. Дела, 1912. – Ч. 2, вып. 2: Рада Великого Княжества Литовского (1492–1569). – 492, XVIII, XXXV с.

11. Мікалаева, Л.В. Адносіны праваслаўнай царквы і праваслаўнага насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага да пытання ўніі з каталіцкай царквой у канцы XV–пачатку XVI стст. / Л.В. Мікалаева// Религия и общество – 6: сб. науч. статей/ под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: УО "МГУ им. А.А. Кулешова", 2011. – С. 62–64.

12. Мікалаева, Л.В. Вобраз "чужога" ў дыпламатычнай дакументацыі Вялікага Княства Літоўскага канца XV–першай чвэрці XVI ст. і адбіццё ў ім прапагандысцкіх элементаў знешняй палітыкі дзяржавы / Л.В. Мікалаева // Приоритеты интеллектуальной элиты в развитии мировой цивилизации: Материалы Международной научно-теоретической конференции, ноябрь 2002 г. – Минск: ЗАО "Веды", 2002. – С. 309–311.

13. Мікалаева, Л.В. Роля рэлігійнага фактару ў ажыццяўленні знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XV–пачатку XVI ст. / Л.В. Мікалаева // Веснік БДУ. Серыя 3. – 2008. – № 1. – С. 3–6.

14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. КМФ-18. Воп. 1. Спр. 5.

15. Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским. – Т. 1: 1487–1533 / Под ред. Г.Ф. Карпова // Сборник Императорского Русского Исторического Общества. – СПб.: Тип-я Ф. Елеонского, 1882. – Т. 35. – VI, 869, XII с.

16. Пирлинг, О. Россия и папский престол/ О. Пирлинг / Пер. с фр. В.П. Потемкина. – М.: печатня А.Л. Будо, 1912. – Кн. 1: Русские и Флорентийский собор. – 452 с.

17. Пресняков, А.Е. Лекции по русской истории / А.Е. Пресняков. – М.: Соцэкгиз, 1939. – Т. 2, вып. 1. – 248 с.

18. Флоря, Б.Н. Древнерусские традиции и борьба восточнославянских народов за воссоединение / Б.Н. Флоря // В.Т. Пашуто, Б.Н. Флоря, А.Л. Хорошкевич. Древнерусское наследие

и исторические судьбы восточного славянства. – М.: Наука, 1982. – 264 с. – С. 151–238.

19. Błaszczyk, G. Litwa na przełome średniowiecza i nowozytności: 1492–1569 / G. Błaszczyk. – Poznań: Wydawnictwo Poznańskie, 2002. – 336 p.

20. Jablonowski, H. Westrussland zwischen Wilna und Moskau. Die politische Stellung und die politischen Tendencen der russischen Bevölkerung des Grossfürstentums Litauen im 15. Jh./ H. Jablonowski// Studien zur Geschichte Ost Europas. – Leiden: Brill, 1955. – 167 p.

21. Kolankowski, L. Polska Jagiellonów. Dzieje polityczne/ L. Kolankowski. – Lwow: Scład główny w księgarni Gubrynowicz i syn, 1936. – 374 p.

22. Pietkiewicz, K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellonczyka. Studia nad dziejami państwa i spoleczeństwa na przełomie XV i XVI wieku/ K. Pietkiewicz. – Poznań: Wydawnictwo Naukowe UAM, 1995. – 256 p.

## Моральный фактор справедливости как катализатор национального самосознания белорусов в истории

Мушинский Н. И. г. Минск, БНТУ

Морально-этический фактор играет важную роль в историческом процессе; чувство исторической справедливости, стремление занять достойное место среди других народов часто становится движущей силой этногенеза. Это в полной мере касается этноконфессиональных процессов в истории Беларуси, когда именно осмысление фундаментальных общечеловеческих критериев справедливости послужило катализатором становления национального самосознания белорусов, поскольку «ідэя нацыянальнага вызваленьня… ідэя незалежнасьці народу… гэта ідэя… справядлівая» [1, с. 18]. Именно через понятие справедливости проблемы национального возрождения и обретения государственной самостоятельности в исторической перспективе поднимаются на уровень этико-философского дискурса.

С точки зрения вынесения справедливого суждения о тенденциях этногенеза на территории Беларуси, можно констатировать, что затруднения в этой области связаны со сложными историческими